**Пярэдадзень.** У пачатку тыдня ў Нацыянальнай бабліятэцы пачала працаваць выстаўка «Выбары ў люстэрку права», прымеркаваная да выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання Рэспублікі Беларусь. На выстаўцы экспануецца каля 70 дакументаў на рускай і беларускай мовах. Сярод прадстаўленых экспанатаў — нарматыўна-прававыя акты, манаграфіі, зборнікі артыкулаў і тэзісаў, матэрыялы дакладаў і навукова-практычных канферэнцый, аналітычных аглядаў, семінараў і круглых сталоў. Убачыць экспазіцыю можна да 1 сакавіка.